тальнікам выхад у рэгіянальную інфармацыйную прастору. Аўтаматызацыя бібліяграфічных працэсаў, рэалізацыя краязнаўчых абласных праграм "Жывая памяць Гомельшчыны", "Памяць Міншчыны", стварэнне інфармацыйнай аўтаматызаванай сеткі "Магілёўская вобласць" ужо ў бліжэйшы час робяць гэтую мэту рэальнай і даюць магчымасць гаварыць, па словах В.А.Факеева, аб "постбібліяграфічным перыядзе" рэгіянальнай бібліяграфіі.

**Петушко Н.Я.,**
суіскальнік кафедры
бібліятэказнаўства

## БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ НЕВІДУШЧЫХ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Рэпазіторый БГУКИ

Кардынальныя змены, якія адбываюцца ў жыцці нашай рэспублікі, прадугледжваюць творчае разуменне разнастайных працэсаў, звязаных з бібліятэчнай справай, і засяроджванне на яе недастаткова распрацаваных праблемах. Да ліку апошніх належаць пытанні, звязаныя з абслугоўваннем асоб з абмежаванымі магчымасцямі.

Спецыяльныя і публічныя бібліятэкі ў наш час павінны ўваходзіць у лік сацыяльных інстытутаў, якія гарантуюць рэалізацыю законнага права інвалідаў на атрыманне імі інфармацыі. Так, у заканадаўчых актах аб развіцці бібліятэчнай справы прадугледжана арганізацыя спецыяльнага абслугоўвання асоб з фізічнымі абмежаваннямі (Канцэпцыя развіцця бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь, 1992; закон Рэспублікі Беларусь"Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь", 1995, Палажэнне аб арганізацыі сеткі бібліятэк Рэспублікі Беларусь", 1993; Тыпавыя правілы карыстання бібліятэкамі ў Рэспубліцы Беларусь, 1996). Аднак у сучасную пару існуюць вялікія цяжкасці ў далучэнні асоб з абмежаванымі магчымасцямі да бібліятэкі.

Звернемся да абслугоўвання сляпых чытачоў у рэспубліцы. Асаблівую ўвагу засяродзім на тых аспектах, якія ствараюць спецыфіку бібліятэчна-бібліяграфічнага абслугоўвання асоб з дэфектамі зроку: сетцы спецыяльных бібліятэк для сляпых і слабавідушчых; асаблівасцях фарміравання фондаў; камплектаванні традыцыйнымі і нетрадыцыйнымі носьбітамі інфармацыі; выдавецкіх функцыях — вытворчасці "размоўных кніг"; асаблівасцях арганізацыі каталогаў і картатэк; арганізацыі даведачна-інфармацыйнай і бібліяграфічнай работы; індывідуальным і масавым абслугоўванні сляпых чытачоў.

У сучасны перыяд у Рэспубліцы Беларусь функцыянуе цэнтралізаваная сетка спецыяльных бібліятэк для сляпых. У яе ўваходзяць 17 бібліятэк-філіялаў пры культурна-рэабілітацыйных цэнтрах, 14 бібліятэчных пунктаў у дамах інвалідаў, санаторыях, школах-інтэрнатах для сляпых і дзяцей, якія дрэнна бачаць, лячэбных установах (па абласцях Беларусі), а таксама 7 спецшкол для невідушчых і слабавідушчых дзяцей, надомны і завочны абанементы. Сукупны фонд Цэнтральнай бібліятэкі сляпых складае каля 184 тыс. экземпляраў кніг рэльефна-кропкавага шрыфту, агучаных, плоскадрукаваных і рэльефна-графічных дапаможнікаў. Бібліятэчным абслугоўваннем ахопленыя 8 тысяч невідушчых (з іх 2 500 абслугоўваюцца Цэнтральнай бібліятэкай).

Асобнае месца ў гэтай сістэме належыць Цэнтральнай бібліятэцы сляпых г. Мінска з функцыямі метадычнага цэнтра, рэспубліканскага сховішча літаратуры, выдадзенай рэльефна-кропкавым шрыфтам, агучаных кніг, дакументаў па тыфлалогіі з агульнай плошчай 1 000 кв. м.

Пры фарміраванні фондаў бібліятэкі для сляпых кіруюцца агульнымі для ўсіх бібліятэк прынцыпамі. Але ёсць асаблівасці, абумоўленыя спецыфікай адбору, выдання і распаўсюджвання літаратуры для сляпых, патрабаваннямі сляпых чытачоў.

Кожная спецыяльная бібліятэка самастойна фарміруе свой фонд. Але Цэнтральная бібліятэка яшчэ і ажыццяўляе

цэнтралізаванае камплектаванне агучанай літаратуры бібліятэк-філіялаў і спецшкол для сляпых дзяцей і дзяцей, якія дрэнна бачаць. Камплектаванне бібліятэк "гаворачымі" кнігамі на магнітных стужках здзяйсняецца на аснове прыкладнага тэматычнага плана агучанай літаратуры.

Рэльефна-кропкавы фонд да 90-х гг. камплектаваўся са спецыяльнай друкарні г. Масквы. З 1997 г. у Мінску функцыянуе спецыяльная друкарня па выпуску вучэбнай і мастацкай літаратуры для сляпых.

Раскрываюцца фонды праз сістэму каталогаў і картатэк, якія маюць сваю спецыфіку, што выяўляецца: у правілах апісання "гаворачых" кніг на магнітных стужках і рэльефна-кропкавых выданняў; фармаце каталожных картак — 12 x 18 ; вядзенні каталогаў.

Цэнтральная бібліятэка мае традыцыйныя і нетрадыцыйныя каталогі і картатэкі (гукавыя, друкаваныя каталогі, выдадзеныя па сістэме Брайля).

Традыцыйныя з іх наступныя: генеральны алфавітны каталог на плоскадрукаваную і рэльефную літаратуру; чытацкі алфавітны каталог; двухбаковы, створаны па сістэме Брайля сістэматычны каталог тыфлалітаратуры, які ўключае агучаную, плоскадрукаваную і рэльефна-кропкавую літаратуру; алфавітная картатэка дыктараў; сістэматычная картатэка артыкулаў "Жыццё невідушчых у Рэспубліцы Беларусь і за мяжой".

Нетрадыцыйныя каталогі і картатэкі ўключаюць: электронны каталог на агучаную, плоскадрукаваную і рэльефна-кропкавую літаратуру; каталогі ў форме кнігі, друкаваныя па сістэме Брайля; алфавітны каталог на рэльефна-кропкавую літаратуру, друкаваныя каталогі "гаворачай" кнігі; алфавітны каталог на агучаную літаратуру.

У аддзеле методыка-бібліяграфічнай работы на фонд тыфлалітаратуры вядзецца сістэматычны каталог. У ім адлюстроўваюцца плоскадрукаваныя, рэльефна-кропкавыя, агучаныя кнігі, артыкулы са зборнікаў. Асаблівай увагі заслугоўвае дзейнасць бібліёграфаў гэтага аддзела па

Рэпазіторый БГУКІ

складанні бягучага бібліяграфічнага паказальніка “Жыццё невідушчых у Рэспубліцы Беларусь і за мяжой”. У названым паказальніку адлюстраваныя звесткі, прысвечаныя жыццю і дзейнасці інвалідаў па зроку ў Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі. На яго аснове вядзецца сістэматычная картатэка артыкулаў “Жыццё невідушчых у Рэспубліцы Беларусь і за мяжой”, якая дазваляе задавальняць запыты абанентаў усёй рэспублікі.

Вядомасцю сярод сляпых і дрэнна відушчых пісьменнікаў, гісторыкаў, культурных дзеячаў карыстаецца бібліяграфічны дапаможнік “Невідушчыя пісьменнікі Рэспублікі Беларусь”, створаны ў 1994 годзе супрацоўнікамі аддзела.

Сумесна з супрацоўнікамі аддзела абслугоўвання праводзяцца бібліятэчна-бібліяграфічнае навучанне прыёмам, навыкам самастойнай арыентацыі ў прасторы, а таксама азнаямленне сляпых з памяшканнем бібліятэкі, яе інтэр’ерам, размяшчэннем фонду, кабін для індывідуальных заняткаў з чытальнікамі, ДБА, кніжных выстаў. Так, да паслуг чытачоў — абанемент выдачы агучанай, рэльефна-кропкавай і плоскадрукаванай літаратуры, які, акрамя непасрэднага абслугоўвання 850 чытачоў, здзяйсняе кніганоства (адзін раз у месяц), афармляе выставы новых паступленняў, выконвае запыты па тэлефоне, вядзе статыстыку.

Важным месцам з’яўляецца чытальная зала, якая абслугоўвае 500 чалавек, дзе створаны камфортныя ўмовы для чытачоў-інвалідаў па зроку.

З мэтамі павышэння эфектыўнасці арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання сляпых і чытачоў, якія дрэнна бачаць, вывучэння зместу і формы іх бібліятэчнага абслугоўвання Цэнтральнай бібліятэкай праведзена даследаванне на тэму “Роля і прызначэнне бібліятэк для сляпых у жыцці невідушчага”. Высветлілася, што для большасці чытачоў бібліятэкі не толькі з’яўляюцца крыніцай папаўнення ведаў, але і атаясамліваюцца з

дыскусійным клубам, дзе можна знайсці аднадумцаў, падзяліцца думкамі.

Чытач з разнастайнымі дэфектамі зроку зацікаўлены ў бібліятэчных мерапрыемствах, звязаных з магчымасцю атрымання інфармацыі пазнавальнага характару. Трэба толькі забяспечыць яму доступ да ўсіх бібліятэчных рэсурсаў рэспублікі, а дзеля гэтага неабходна, каб:

— любая бібліятэка, што ёсць у горадзе, раёне, "павярнулася тварам" да патрэб інвалідаў у атрыманні ведаў, адукацыі, да іх жадання спазнаваць навакольны свет;

— персанал бібліятэкі павінен прыцягваць сваіх чытачоў-інвалідаў да місіянерскай працы на карысць іншых інвалідаў, якія пакуль што не знайшлі месца ў грамадстве;

— у бібліятэцы павінна быць добра наладжана даведачная служба па ўсіх пытаннях сацыяльнага жыцця;

— у бібліятэцы мусяць аб'ядноўвацца намаганні ўрачоў, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, карпарацый.

**Салех Кайс (Сирия),**
аспирант кафедры
библиотековедения

## ВЗАИМОДЕЙСТВИЯ ПЕРСОНАЛА БИБЛИОТЕКИ И ПРЕПОДАВАТЕЛЕЙ В ДАМАССКОМ УНИВЕРСИТЕТЕ

Преподаватель университета в Сирийской Арабской Республике подчиняется тем же требованиям, что и в Республике Беларусь. Обязательным является сочетание учебной, научной и воспитательной работы. Желательно, кроме того, наличие ученой степени. При периодической аттестации также учитывается число публикаций. В свое время Советский Союз внес большой вклад в подготовку



Репозиторий БГУКИ